## Воранаўская раённая бібліятэка

**25.01.2022** Урок бяспекі "Выратаванне жыцця – занятак ганаровы" прайшоў у аддзела абслугоўвання і інфармацыі для вучняў 4"Г" класа. На мерапрыемства быў запрошаны супрацоўнік МНС Хлюст Вадзім Юр'евіч, які растлумачыў дзецям пра бяспечнасць з агнём у зімовы час і правілы паводзін на лёдзе. Выратавальнік правёў гульнёвую віктарыну і паказаў дзецям відэаролік па тэхніцы пажарнай бяспекі.

**28.01.2022**. Для бібліятэчных спецыялістаў быў праведзены круглы стол вынікі працы бібліятэк за 2021 год і прыярытэтныя напрамкі дзейнасці на 2022 год.

У ходзе нарады былі падведзены вынікі працы справаздачнага года, зроблены аналіз справаздач, праведзеных мерапрыемстваў, аналіз працы ў сацыяльных сетках і на сайце ДУК "Воранаўская раённая бібліятэка", аналіз працы аддзела камплектавання. Па гэтых пытаннях выступілі дырэктар Камінская Н. В., загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Фурман Л. І., загадчык аддзела камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду Гайдзіс Л. П. Таксама падвялі вынікі раённага конкурсу "Кніжная выстава: новы фармат", "Нам ёсць кім ганарыцца". Адбылося ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу.

**28.02.2022** Аддзел абслугоўвання і інфармацыі наведаў Воранаўскі РЭС з кніжнай выставай "Галоўны Закон нашага жыцця". Работнікі РЭС мелі магчымасць азнаёміцца з праектам змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, адсачыць гісторыю ўзнікнення першага беларускага дакумента Статута ВКЛ 1588 года, даведацца аб прыняцці першай і наступных Канстытуцый Рэспублікі Беларусь. Бібліятэкары праінфармавалі аб правядзенні рэферэндуму, які адбудзецца 27 лютага. Усім наведвальнікам прапаноўвалася стаць чытачамі бібліятэкі і пазнаёміцца з мастацкай літаратурай павышанага попыту на выставе "Гадзіна добрай кнігі ".

**07.02.2022** З нагоды 210 – годдзя з дня нараджэння Чарльза Дзікенса, напярэдадні юбілею ў аддзеле абслугоўвання і інфармацыі прайшла пазнавальная віктарына "Незабыўны свет Чарльза Дзікенса". Дзеці пазнаёміліся з цікавай біяграфіяй аўтара і некаторымі яго творамі "Олівер Твіст" , "Калядная песня" і інш. У канцы мерапрыемства ўдзельнікі адказалі на пытанні віктарыны па біяграфіі і літаратурнай дзейнасці пісьменніка.

**16.02.2022** 15 лютага адзначаецца Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. У сувязі з гэтай падзеяй у аддзеле абслугоўвання і інфармацыі прайшоў урок мужнасці "Па дарогах афганскай вайны". На мерапрыемства былі запрошаны навучэнцы Воранаўскага прафесійна-тэхнічнага каледжа. У якасці ганаровага госця прысутнічаў наш зямляк, воін-афганец Мікутайціс Гендрык Казіміравіч. Дзеці даведаліся аб тых даўніх падзеях вайны ў Афганістане. Гендрык Казіміравіч расказаў прысутным, як стаў удзельнікам той вайны, што давялося

перажыць, аб самых запамінальных момантах жыцця ў той перыяд. Прысутныя ўшанавалі памяць воінаў-інтэрнацыяналістаў хвілінай маўчання. У завяршэнне мерапрыемства прысутныя пазнаёміліся з матэрыяламі, прадстаўленых на выставе “Афганістан баліць у душы маёй...”.

**17.02.2022** У аддзеле абслугоўвання і інфармацыі прайшоў Дзень інфармацыі “Молодёжный перекрёсток”. На мерапрыемства былі запрошаны навучэнцы Воранаўскага прафесійна-тэхнічнага каледжа. Бібліёграф дала інфармацыю аб новых паступленнях літаратуры для моладзі. На выставе “Девчонки и мальчишки, читайте эти книжки” была прадстаўлена мастацкая літаратура розных жанраў : прыгоды, фэнтэзі, містыка, гістарычныя раманы, а таксама галіновая літаратура, якая дапамагае атрымаць адказы на розныя пытанні і дае магчымасць пашырыць свой кругагляд.

**18.02.2022** На базе ДУК“Воранаўская раённая бібліятэка” арганізаваны валанцёрскі моладзевы рух “Энергія маладосці”. Любіце чытаць кнігі? Хочаце творча развівацца? Рабіць добрыя справы і праводзіць час з карысцю? Тады далучайцеся да нас!!!Прайшоў першы арганізацыйны збор моладзевага валанцёрскага руху “Энергія маладосці”. Вызначаны задачы на год, складзены план мерапрыемстваў, створана эмблема, унесены прапановы па арганізацыі валанцёрскай дзейнасці. Ёсць упэўненасць, што стварэнне валанцёрскага моладзевага руху дазволіць актывізаваць і сістэматызаваць грамадскую актыўнасць моладзі.

**18.02.2022** “Ад зерня – колас, ад слова – мова” пад такой назвай у ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка” прайшоў дзень бібліяграфіі да Міжнароднага дня роднай мовы. Наведвальнікі бібліятэкі пазнаёміліся з кніжнай выставай і даведаліся шмат цікавага аб узнікненні беларускай мовы, аб новых змяненнях у правапісе. Сярод слоўнікаў беларускай мовы вялікая разнастайнасць тэматычных : тлумачальныя, фразеалагізмаў, арфаграфічныя і г.д. Карысную інфармацыю атрымалі вучні і навучэнцы ў дапамогу вывучэння роднай мовы.

**15.03.2022** 15 сакавіка Беларусь адзначае дзяржаўнае свята-Дзень Канстытуцыі. Сёння, у гісторыю нашай краіны ўпісана новая старонка-уступае ў сілу новы Асноўны Закон. Супрацоўнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі Воранаўскай раённай бібліятэкі сумесна з адвакатам юрыдычнай кансультацыі Журко Л. Г. правялі ўрок прававых ведаў «Канстытуцыя – сімвал эпохі» для навучэнцаў Воранаўскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа сельскагаспадарчай вытворчасці. Прысутныя пазнаёміліся з зменамі ў палітычнай сістэме, сацыяльнай сферы, маладзёжнай палітыцы, ролі грамадзянскай супольнасці. Мерапрыемства прайшло ў форме дыялогу. Для наведвальнікаў бібліятэкі была прадстаўлена тэматычная выстава “Галоўны Закон нашага жыцця”.

**18.03.2022** У аддзеле абслугоўвання і інфармацыі прайшла гадзіна пажарнай бяспекі “Осторожен будь с огнём: утром, вечером и днём”. З вучнямі 4 класа прайшла размова аб асабістай бяспецы і аб правілах карыстання запалкамі. Бібліятэкар расказала як правільна сябе паводзіць у выпадку ўзнікнення пажараў і аб асцярожных адносінах з агнём. Вучні задавалі пытанні, уступалі ў дыялог. Сустрэча атрымалася цікавай і пазнавальнай.

***Да году гістарычнай памяці***

У Воранаўскай раённая бібліятэцы прайшоў агляд тэматычнай кніжнай выставы да Году гістарычнай памяці “Историческая память в книжном наследии”. Бібліёграф пазнаёміла наведвальнікаў бібліятэкі з хроніка-дакументальнымі выданнямі і мастацкімі творамі беларускіх і рускіх класікаў на тэму Вялікай Айчыннай вайны.

У аддзеле абслугоўвання і інфармацыі прайшоў урок памяці “Халакост: у сэрцы і памяці-навечна”. На мерапрыемстве прысутнічалі навучэнцы 8 “А” класа ДУА “Воранаўская сярэдняя школа”. Падчас мерапрыемства гаворка ішла аб варварскіх злачынствах фашыстаў супраць габрэйскага народа падчас Другой сусветнай вайны. Аповяд суправаджаўся паказам відэароліка “У памяць ахвяраў Халакосту”. Перад удзельнікамі мерапрыемства выступіла старшыня Воранаўскай раённай арганізацыі Беларускага аб’яднання ветэранаў Людміла Канстанцінаўна Сазон, якая распавяла пра генацыд габрэйскага народа на тэрыторыі Воранаўскага раёна. Дзеці змаглі даведацца больш пра Халакост, адчуць увесь жах катастрофы, пазнаёміцца з літаратурай, фотадакументамі, рэпрадукцыямі, прадстаўленымі на кніжнай выставе “Халакост-памяць пакаленняў”.

У памяць аб юных героя-антыфашыстах у раённай бібліятэцы прайшоў урок мужнасці “Дзеці суровай вайны ліхалецця”. На мерапрыемства былі запрошаны вучні 7 “Е” класа. У ходзе ўрока юнакі і дзяўчаты даведаліся аб іх равесніках, якія нароўні з дарослымі змагаліся з ворагам у час Вялікай Айчыннай вайны. Увазе былі прапанаваны відэаролік “Маленькія дзеці вялікай вайны” і кніжная выстава “Прайшла праз дзяцінства вайна”.

Бібліятэкар філіяла “Канвелішская сельская бібліятэка” правяла агляд тэматычнай кніжнай выставы “Пусть знают и помнят потомки”. Прадстаўленая літаратура зацікавіла і юных чытачоў і дарослых наведвальнікаў бібліятэкі. Ведаць гісторыю — значыць быць патрыётам, думаючай і свабоднай асобай, якая ўмее арыентавацца ў сучасным зменлівым свеце і рабіць правільны выбар.

У філіяле “Пагародзенская сельская бібліятэка” прайшла інфармацыйная гадзіна “Мы ганарымся сваёй краінай”. Прысутныя азнаёміліся з кніжнай выставай “Гераічныя старонкі нашай гісторыі”. Бібліятэкар надала ўвагу драматычным старонкам жыцця краіны, тым самым, фарміруючы навыкі юнага патрыёта сваёй Радзімы, распавяла як выхоўваць валявыя якасці на

прыкладах герояў вайны, як прывіваць беражлівыя адносіны да гістарычнага мінулага Айчыны.

Бібліятэкар філіяла “Канвелішская сельская бібліятэка” Сініцкая Т.С. сумесна з настаўнікам Русак Г. Ф. ВПК “Канвелішскія яслі - сад сярэдняя школа” правялі мерапрыемства “Беларускія ручнікі у абрадах і звычаях” да Году гістарычнай памяці. Мерапрыемства праходзіла для вучняў 6-10 класаў. Бібліятэкар узгадала гісторыю беларускага ручніка, яго традыцыйнае аздабленне, шлях ад сцяблінкі ільну да гатовага вырабу. Вучні праслухалі тэматычныя песні і вершы.

## *Эстэтычнае выхаванне*

Пазнавальная гадзіна “ Дзе і як сустракаюць Новы год” прайшоў у філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка ”для дзяцей аздараўленчага лагера “Зімовы гарадок”. Дзеці паслухалі прыгожую калядную казку, даведаліся як сустракаюць Новы год у розных краінах свету, якія звычаі і традыцыі сустрэчы свята ёсць у розных народаў, як называюць Дзеда Мароза ў розных краінах.

У філіяле “Пагародзенская сельская бібліятэка”, прайшло фальклорнае мерапрыемства “Раждјаства чароўныя імгненні” для дзяцей школьнага лагера. Бібліятэкар расказала дзецям аб гісторыі дзівоснага свята Раства Хрыстова і адкуль прыйшла традыцыя яго адзначаць. Таксама для дзяцей была праведзена гульня “Калядныя калядкі”.

Літаратурна-музычная кампазіцыя “Зимней сказочной порой” прайшла ў філіяле “Нацкая сельская бібліятэка”.Дзеці прачыталі вершы зімовай тэматыкі, прынялі ўдзел у зімовай віктарыне і ў розных тэматычных конкурсах. Весела і з карысцю правялі свой вольны час.

Для выхаванцаў ДУА“ВПК Нацкія яслі-сад-сярэдняя школа” бібліятэкар філіяла “Нацкая сельская бібліятэка” правяла забаўляльна-гульнёвую праграму “Навагодняя казка” .Дзеці прымалі ўдзел у навагодніх гульнях і конкурсах, разгадвалі загадкі, вадзілі карагоды, распавядалі вершы і разглядалі пад елкай кніжкі з навагоднімі казкамі.

У філіяле “Доцішская сельская бібліятэка” прайшло мерапрыемства “От Рождества до Крещения". Бібліятэкар распавяла дзецям аб Куцці, пазнаёміла з традыцыямі Раства Хрыстова, Калядамі, якія доўжацца на працягу 12-ці дзён ад Каляд да хрышчэння і што такое калядаванне. Удзельнікі пазнаёміліся з легендамі, традыцыямі, абрадамі, народнымі забавамі і прыметамі свята. Таксама дзеці ўдзельнічалі ў каляднай сцэнцы і падзяліліся сямейнымі традыцыямі святкавання Хрышчэння.

## **У аматарскіх аб'яднанях**

Для ўдзельнікаў аматарскага аб'яднання “Надзея ” ў Воранаўскай раённай бібліятэцы прайшла калядная сустрэча “Святло Каляднай зоркі”. Удзельнікі пазнаёміліся з гісторыяй нараджэння Ісуса Хрыста, каляднымі сімваламі,

традыцыямі сустрэчы гэтага свята. Госці актыўна ўдзельнічалі ў розных конкурсах, адказвалі на пытанні віктарыны, адгадвалі загадкі... Кожны з удзельнікаў сустрэчы распавёў аб сямейных звычаях і традыцыях святкавання Раства. У завяршэнні мерапрыемства для прысутных быў праведзены агляд кніжнай выставы “З Калядамі і Новым годам”.

У філіяле “Місявіцкая сельская бібліятэка” прайшла калядная сустрэча ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Бяседа” “Прыйшла Каляда напярэдадні Калядаў”. Бібліятэкар звярнулася да гісторыі свята, расказала аб традыцыях і прыкметах, якія суправаджаюць святкаванне Каляд на працягу многіх стагоддзяў і правяла для гасцей адмысловую віктарыну. Хтосьці з удзельнікаў распавёў смешныя сямейныя гісторыі, а хтосьці аб сямейных традыцыях звязаных з Калядамі.

У Беларусі даўняя багатая гісторыя традыцыйных мастацтваў і рамёстваў, многія з якіх існуюць і цяпер. Да Году гістарычнай памяці ў філіяле “Нацкая сельская бібліятэка” прайшло пасяджэнне ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Натхненне”. Удзельнікі пазнаеміліся з традыцыйнымі рамёствамі і промысламі. Таксама бібліятэкар акцэнтавала ўвагу дзяцей на значэнні старажытных каранёў народных ужытковых промыслаў і выкарастанні гэтых відаў рамёстваў у сучасным жыцці.

У філіяле “Доцішская сельская бібліятэка” прайшоў экалагічны ўрок “ У саюзе з прыродай” для ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Юны эрудыт”. У ходзе мерапрыемства дзеці даведаліся як трэба берагчы прыроду і яе рэсурсы, які ўплыў чалавек аказвае на навакольнае асяроддзе і што трэба рабіць для таго, каб захаваць наш агульны дом – планету Зямля. Таксама ўдзельнікі даведаліся, што ва ўсім свеце праходзіць цэлы шэраг мерапрыемстваў, накіраваны на ахову навакольнага асяроддзя. Гэта і стварэнне запаведнікаў, нацыянальных паркаў, гадавальнікаў і батанічных садоў. І Чырвоная кніга, у якую заносяцца рэдкія і знікаючыя віды раслін і жывёл. Увазе дзяцей была прадстаўлена тэматычная кніжная выстава “Гэты дзіўны свет прыроды”, якую яны глядзелі з вялікай цікавасцю.

Інфармацыйны час “Ахова птушак Бацькаўшчыны” для ўдзельнікаў аматарскага аб'яднання “Юны эрудыт” прайшоў у філіяле “Доцішская сельская бібліятэка”. Бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з светам птушак і цікавымі фактамі з жыцця птушак, пра тое якія птушкі застаюцца зімаваць у нашых краях і якую карысць яны прыносяць. Таксама дзеці падзяліліся сваім вопытам клопату пра птушак, распавялі, як дапамагаюць ім у зімовы перыяд.

Для удзельнікаў аматарскага аб’яднання “Грамадзянін” у філіяле “Жырмунская інтэграваная сельская бібліятэка” прайшла інтэлектуальная гульня “Прававы калейдаскоп”. У працэсе гульні дзеці пабывалі на станцыях: “Правы і абавязкі”, “Юрыдычная кансультацыя”, “ Права ў прыказках”, “Займальная віктарына” і інш. таксама навучэнцы пазнаёміліся з прававой літаратурай, якая ёсць у бібліятэцы.

У філіяле “Бастунская інтэграваная сельская бібліятэка” прайшло пасяджэнне аматарскага аб'яднання “Знахарка”. Удзельнікі аб’яднання пазнаёміліся з кніжнай выставай “Фітатэрапія і наша здароўе”, на якой былі прадстаўлены кнігі лекавых раслін і гаючых траў, якія ўжываюцца ў народнай медыцыне.

У аддзеле абслугоўвання і інфармацыі Воранаўскай раённай бібліятэкі для ўдзельнікаў аматарскага аб'яднання “Непаседы” прайшла гульнёвая праграма “Падарожжа па краіне здароўя”. Бібліятэкары патлумачылі дзецям, што трэба адказна ставіцца да ўласнага здароўя, аб спосабах прафілактыкі разнастайных захворванняў, аб гігіенічных нормах. Дзеці наведалі такія станцыі як: “ Мойдадырава”, “Лясная”, “Спартыўная”. У заключэнні мерапрыемства дзеці з радасцю прынялі ўдзел у конкурсе “Продли прыказку”, адгадвалі загадкі, а таксама паўдзельнічалі ў рухомых гульнях.

У філіяле “Жырмунская інтэграваная сельская бібліятэка” прайшоў круглы стол “Любіце жыццё, яно цудоўнае” для ўдзельнікаў аматарскага аб'яднання “Грамадзянін”.Бібліятэкар расказала вучням аб шкодных звычках, аб тым, што трэба шанаваць сваё жыццё і клапаціцца пра сваё здароўе. Таксама дзеці ўдзельнічалі ў віктарыне “Ці ведаеце вы?” і прагледзелі відэаролік.

У філіяле “Нацкая сельская бібліятэка ” адбылося пасяджэнне аматарскага аб'яднання. “Натхненне”. Удзельнікі сабраліся напярэдадні Міжнароднага жаночага дня 8 сакавіка, каб змайстраваць падарунак сваімі рукамі. Бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з гісторыяй узнікнення свята, а затым хлопцы прынялі ўдзел у майстар-класе “Букет для мамы”.

У філіяле “Канвелішская сельская бібліятэка” прайшло пасяджэнне аматарскага аб'яднання “Скарбніца”, да Міжнароднага жаночага дня. У гэты дзень вельмі хочацца здзівіць і парадаваць цікавым падарункам маму, а як вядома, лепшы падарунак - гэта падарунак, зроблены сваімі рукамі.

У філіяле “Місявіцкая сельская бібліятэка” прайшло чарговае пасяджэнне аматарскага аб’яднання “Бяседа”. Вясновая сустрэча “Вам, непаўторным, як вясна”, прысвечаная Дню жанчын, прайшла ў радаснай, нязмушанай абстаноўцы. Віншаванні і вершы гучалі для мілых жанчын. Песні, жарты і прыпеўкі пра жанчыну, падрыхтаваныя работнікамі філіяла “Місявіцкі цэнтр культуры і вольнага часу” стварылі атмасферу свята і добрага настрою. Скончылася мерапрыемства праглядам тэматычнай выставы “Жанчыны-легенды”.

У філіяле “Доцішская сельская бібліятэка” прайшла гутарка “Браты нашы меншыя” з удзельнікамі аматарскага аб’яднання “Юны эрудыт”. У ходзе мерапрыемства дзеці даведаліся аб тым, як важна беражліва і адказна ставіцца да хатніх жывёл і да ўмоў іх утрымання, аб рэдкіх і знікаючых відах жывёл, аб тым, якія меры прымаюцца ў нашай краіне, каб абараніць іх. Таксама бібліятэкар пазнаёміла ўдзельнікаў мерапрыемства з кнігамі пра жывёл і парэкамендавала да чытання самыя цікавыя з іх.

### *Бібліятэка - дзецям*

Супрацоўнікі філіяла “Радунская гарпасялковая бібліятэка” правялі для дзяцей першых класаў ДУА “Радунская СШ” знаёмства з бібліятэкай “ Падарожжа ў Каралеўства кніг”. Дзеці апынуліся ў кніжным царстве, дзе іх чакалі чароўныя цуды. У ходзе мерапрыемства дзеці даведаліся, дзе і як размяшчаюцца кнігі, правілы карыстання бібліятэкай, аб тым, як трэба сябе весці ў бібліятэцы і як звяртацца з кнігамі. Дзеці расказалі аб сваіх любімых кніжных героях, удзельнічалі ў літаратурных віктарынах, адгадвалі загадкі. У канцы мерапрыемства для ўдзельнікаў правялі экскурсію па бібліятэцы і паказалі самую тонкую і самую тоўстую, самую маленькую і самую вялікую, самую старую і самую новую кнігі.

Бібліятэкар філіяла “Доцішская сельская бібліятэка” правяла конкурсную праграму “Адзін аднаго Абнімем”, прысвечаная Міжнароднаму дню абдымкаў. Бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з гісторыяй незвычайнага свята, з відамі абдымкаў, як абдымкі ўплываюць на чалавека.

Прапаганда духоўна-маральнай літаратуры з’яўляецца адным з важных напрамкаў работы бібліятэк. У філіяле “Тракельская сельская бібліятэка” была арганізавана кніжная выстава “Скарбы духоўнай мудрасці”. На выставе прадстаўлены выданні рэлігійнай тэматыкі. Гэта кнігі па гісторыі рэлігіі, пра жыццё святых, па маральнаму выхаванню дзяцей і моладзі, выдання асвятляюць рэлігійныя звычаі і традыцыі, а таксама тэматычная мастацкая літаратура.

Для вучняў пачатковых класаў у філіале “Нацкая сельская бібліятэка” прайшло літаратурна-музычнае падарожжа “Мая краіна — Беларусь”. Дзеці падчас падарожжа спыняліся на астравах. Кожны прыпынак меў сваю назву, які адпавядаў тыпу заданняў. Дзеці адказвалі на пытанні, разгадвалі загадкі і прапанаваныя крыжаванкі. На апошнім востраве праглядзелі відэафільм “Нача: крокі гісторыі”.

### *Да Дня юнага героя -антыфашыста*

У філіяле “Тракельская сельская бібліятэка” прайшла гутарка-дыялог “Дзеці Вайны”. Бібліятэкар распавяла дзецям, што штогод 8 лютага з 1964 года ў свеце адзначаецца Дзень юнага героя-антыфашыста, які быў зацверджаны чарговай Асамблеяй ААН. Дзеці даведаліся аб піянерах-героях, а таксама пра тое, як гераічна змагаліся ў час вайны юныя партызанскія разведчыкі. У канцы мерапрыемства бібліятэкар правяла агляд кніг аб Вялікай Айчыннай вайне.

Гутарка “Маленькія героі вялікай вайны” была праведзена ў філіяле “Доцішская сельская бібліятэка”. Бібліятэкар расказала аб гісторыі стварэння свята, аб юных героях, якія аддалі свае жыццё за Радзіму, пра зусім кароткае, але гераічнае жыццё піянераў, якім пасмяротна было прысвоена званне Героя

Савецкага Саюза.

Бібліятэкар філіала “Бастунская інтэграваная сельская бібліятэка” правяла агляд літаратуры “Дзеці вайны” для вучняў 7 класа. Дзеці даведаліся пра суровы час вайны, пра юных піянераў і школьнікаў, якія разам з дарослымі мужна змагаліся супраць фашысцкіх захопнікаў, а таксама пазнаёміліся з творамі пісьменнікаў, якія пісалі пра Вялікую Айчынную вайну.

У філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка” прайшла літаратурная гадзіна “Салдат вялікай вайны. Генерал вялікай літаратуры”. Бібліятэкар расказала прысутным калі і чаму была ўстаноўлена традыцыя ўшаноўваць памяць юных герояў-антыфашыстаў, а таксама падрыхтавала кароткія паведамленні пра подзвігі піянераў-герояў. Для нагляднасці была арганізавана кніжная выстава “Маленькие солдаты большой войны ” .

***Літаратурна - юбілейная старонка***

У філіале “Жырмунская інтэграваная сельская бібліятэка” прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя “Не забывай ніколі, дружа, сваю зямлю…”, прысвечаная ***80-годдзю з дня нараджэння В.Вярбы.*** Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з жыццёвым і творчым шляхам паэтэсы. Асаблівую ўвагу звярнула на зборнікі паэзіі “Вочы вясны”, “Пралеска”, “Высакосны год” і інш. Для ўдзельнікаў мерапрыемства была праведзена віктарына па творчасці паэтэсы і арганізавана кніжная выстава “Не забывай ніколі, дружа, сваю зямлю...”

Бібліятэкар філіяла “Доцішская сельская бібліятэка” правяла конкурс чытальнікаў “Вянок памяці”, ***да 80-годдзя з дня нараджэння Веры Вярбы***, беларускай паэтэсы, перакладчыцы... Удзельнікі мерапрыемства чыталі вядомыя вершы паэтэсы, а таксама бібліятэкар пазнаёміла прысутных з яе жыццёвым і творчым шляхам.

У філіяле “Тракельская сельская бібліятэка” прайшло літаратурнае знаёмства з творчасцю беларускага пісьменніка, сцэнарыста і драматурга ***Георгія Марчука “З павагай да зямлі і людзям” (да 75-годдзя з дня нараджэння пісьменніка).*** Дзеці даведаліся аб жыцці і творчасці аўтара, аб прынцыпах, на якіх грунтуецца яго творчасць і пазнаёміліся з яго казкамі.

***Да 190 – годдзя з дня нараджэння выдатнага ангельскага пісьменніка Люіса Кэрала,*** у аддзеле абслугоўвання і інфармацыі адбылася літаратурная гульня “Краіна цудаў Кэрала”. Дзеці здзейснілі фантастычнае падарожжа ў уяўны і дзіўны свет казкі “Аліса ў краіне цудаў”, з задавальненнем адказалі на пытанні літаратурнай гульні, а таксама ўзялі дадому пачытаць гэтую кнігу.

Бібліятэкар філіяла “Нацкая сельская бібліятэка” правяла літаратурны круіз “Хто дзецям Віні-Пуха падарыў”, прысвечаны ***140-годдзю з дня нараджэння англійскага пісьменніка Алана Мілна.*** Дзеці пазнаёміліся з творчасцю і біяграфіяй пісьменніка і даведаліся, як быў прыдуманы гэты казачны персанаж. Паглядзелі мультфільм “Віні-Пух”, а таксама прынялі ўдзел у

тэматычнай віктарыне.

У студзені 2022 года споўнілася 140 гадоў з дня нараджэння англійскага пісьменніка Алана Мілна, аўтара кніг пра медвежонке Віні-Пуха, гісторыі аб якім ён напісаў для свайго сына. Да гэтай даты ў філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка” праведзена кніжнае асарці “Хто дзецям Віні-Пуха падарыў” для членаў аматарскага аб'яднання “Калакольчык”. У ходзе мерапрыемства дзеці даведаліся аб гісторыі стварэння персанажаў цыкла твораў аб медвежонке Віні-пуха, а таксама пра пісьменніка Алан Мілне. Таксама для прысутных была афармлена аднайменная кніжная выстава.

Для чытачоў філіяла “Канвелішская сельская бібліятэка” адбыўся паказ прэзентацыі, прымеркаваны ***да 210-годдзя з дня нараджэння Чарльза Дзікенса.*** Чарльз Дыкенс адзін з найвялікшых англамоўных празаікаў XXI стагоддзя, гуманіст, класік сусветнай літаратуры. Чытачы пазнаёміліся з біяграфіяй і творчасцю пісьменніка, з яго вядомым раманам “Прыгоды Олівера Твіста”.

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі Воранаўскай раённай бібліятэкі правёў літаратурную гадзіну “Светлы воблік паэта” ***да 65-годдзя з дня нараджэння беларускага пісьменніка Алеся Пісьмянкова.*** Бібліятэкары расказалі дзецям пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, пазнаёмілі з яго вясёлымі вершамі, у якіх адлюстроўваецца свет дзіцячай фантазіі і чароўнага ўспрыняцця навакольнага асяроддзя.

***У згодзе з прыродай***

У філіяле “Забалацкая інтэграваная сельская бібліятэка” прайшла гадзіна разважання “Не шкодзь прыродзе, жыві з ёй у згодзе”. Бібліятэкар распавяла прысутным пра раслін і жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу, якія растуць і водзяцца ў Беларусі. З вялікай трывогай вучні прынялі навіну, што людзьмі-браканьерамі знішчаецца вялікая колькасць рэдкіх птушак і звяроў, зрываюцца рэдкія расліны. Кожны выказаў сваю думку, ніхто не застаўся раўнадушным і гэта вельмі радуе!

***<u>Патрыятычнае выхаванне</u>***

У філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка” прайшла гадзіна інфармацыі “Праект будучыні”, прымеркаваны да рэферэндуму па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Бібліятэкар распавяла прысутным аб прапанаваных зменах і дапаўненнях у Канстытуцыі, захаванні гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа. Дапоўнілі мерапрыемства матэрыялы з перыядычных выданняў, прысвечаныя рэферэндуму.

## *Да Дня памяці воінаў -інтэрнацыялістаў*

Філіял “Бастунская інтэграваная сельская бібліятэка ” сумесна з ДУА “ВПК Бастунскія яслі-сад-базавая школа” правялі Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў “Афганістан у лёсах нашых землякоў”. На мерапрыемстве прысутнічалі старшыня Беларускага саюза воінаў-ветэранаў Афганістана Мікутайціс Генрых Казіміравіч, Дайлідка Станіслаў Зігмундавіч, Суцкель Валяр'ян Валяр'яновіч. Для гасцей у бібліятэцы была арганізавана тэматычная кніжна-ілюстрацыйная выстава “Ніхто не забыты - нішто не забыта”.

Да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў супрацоўнікі філіяла "Радунская гарпарселкавая бібліятэка" правялі вечар памяці “Афганістан: баліць у маёй душы” для навучэнцаў “6” А ДУА “Радунская сярэдняя школа”. Бібліятэкар расказала дзецям аб падзеях афганскай вайны, таксама ім была прадстаўлена прэзентацыя пра воінаў-інтэрнацыяналістаў і баявых подзвігах. Навучэнцы слухалі вершы і песні, прысвечаныя афганскай вайне. Скончылася мерапрыемства хвілінай маўчання ў памяць пра воінаў-інтэрнацыяналістаў.

У філіяле “Забалацкая інтэграваная сельская бібліятэка” прайшла гадзіна ўспамінаў “Час і памяць”. На мерапрыемстве прысутнічалі вучні 5 класа. Школьнікі даведаліся аб сваіх земляках-воінах-афганцах і іх службе ў той нялёгкі час. У заключэнне быў прадэманстраваны дакументальны фільм пра маладых хлопцаў, якія прысягнулі Радзіме і мужна і гераічна змагаліся, выконваючы загады камандзіраў.

## *МОВА-ДУША НАРОДА*

Да Міжнароднага дня роднай мовы ў філіяле “Нацкая сельская бібліятэка” на працягу тыдня з 16 па 20 лютага чытачы знаёміліся з беларускамоўнымі выданнямі на выставах: “Чытаем – па беларуску”, “Зрабі ласку прачытай беларускую казку” у рамках акцыі “Моўны дзень у бібліятэцы”. Падчас правядзення акцыі наведвальнікі бібліятэкі мелі магчымасць пазнаёміцца з вядомымі пісьменнікамі і паэтамі і іх творчасцю. Кожнаму, хто завітаў у бібліятэку, прапанавалі павітацца па-беларуску.

У філіяле “Бастунская інтэграваная сельская бібліятэка” наведвальнікі бібліятэкі пазнаёміліся з кніжнай выставай “Скарбы роднай мовы”.На ёй былі прадстаўлены творы беларускіх пісьменнікаў.

Бібліятэкар філіяла “Жырмунская інтэграваная сельская бібліятэка” правяла інфармацыйную гадзіну “Язык – жывая душа народа”, рассказала ўдзельнікам пра гісторыю ўзнікнення Дня роднай мовы. А таксама пра неабходнасць захоўваць, паважаць, любіць і шанаваць родную мову, бо менавіта ў ёй — гісторыя народа. У канцы мерапрыемства для дзяцей была праведзена віктарына “Ці ведаем мы родную мову?”.

Напярэдадні Міжнароднага дня роднай мовы ў філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка” з 18 па 20 лютага праходзіла акцыя “Размаўляй са

мной па-беларуску”. У гэтыя дні супрацоўнікі бібліятэкі размаўлялі са сваімі чытачамі толькі на беларускай мове. Да увагі наведвальнікаў бібліятэкі была прадстаўлена кніжная выстава “Далучыся да роднага слова”. Чытачы мелі магчымасць выбраць на свой густ кніжку на беларускай мове. Актыўным удзельнікам акцыі прапаноўвалі пагуляць у гульню “Ці ведаем мы беларускую мову?”.

У філіяле “Забалацкая інтэграваная сельская бібліятэка” разам з вучнямі 11 класа ДУА “ВПК Забалацкія яслі-сад-сярэдняя школа” прайшла гадзіна роднай мовы “Мова маіх продкаў знікнуць непавінна”. Бібліятэкар ўзгадала пра гістарычны шлях беларускай мовы, пра вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Гучалі вершы, прыказкі і прымаўкі, прыгожыя вобразныя выслоўі, прысвечаныя роднай мове. Таксама на мерапрыемства была запрошана наша зямлячка, пісьменніца Алена Запаснік, дзе яна прэзентавала свой зборнік казак.

Літаратурная гадзіна “Адвечны голас Радзімы” прайшла ў філіяле “Пагародзенская сельская бібліятэка”. На мерапрыемстве прысутнічалі вучні 5-6 класаў Пагародзенскай СШ. Бібліятэкар ўзгадала пра гістарычны шлях беларускай мовы, пра вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Таксама для дзяцей быда праведзена тэматычная віктарына і конкурсны. Удзельнікі з задавальненнем разгадвалі загадкі і літаратурныя крыжаванкі, састаўлялі прыказкі і адказвалі на пытанні.

**Да дня абаронцаў Айчыны**

У філіяле “Тракельская сельская бібліятэка” Айчыны прайшоў урок мужнасці “Ёсць такая прафесія Радзіму абараняць”. Бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з гісторыяй свята 23 лютага. Гаварыла з вучнямі пра мужнасць, гераізм, пра патрыятызм – любоў да Радзімы, адданасць ёй, імкненне сваімі справамі служыць яе інтарэсам.

У аддзеле абслугоўвання і інфармацыі Воранаўскай раённай бібліятэкі была прадстаўлена выстава-інсталяцыя “Сапраўдныя мужчыны служаць Айчыне!”. Дзеці пазнаёміліся з кнігамі аб ваеннай тэхніцы і атрыбутыкай, а мужчын зацікавіла больш сур'ёзная літаратура - аб служачых беларускай арміі, аб тых, хто выконвае свой воінскі абавязак на мяжы нашай Радзімы.

Гульнёвая праграма “Смелыя, сільныя, спрытныя” прайшла ў філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка”. На мерапрыемства былі запрошаны вучні пачатковых класаў ДУА “Радунская СШ”. Да ўвагі школьнікаў была прадстаўлена прэзентацыя з гісторыяй стварэння ўзброенных Сіл Рэспублікі Беларусь. Падлеткі з вялікай ахвотай разгадвалі рэбусы, а таксама прымалі ўдзел у віктарынах і конкурсах: “Рыцарскі турнір”, “Наряд вне очереди”, “Подъём” і др.

## *Да міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам*

У бібліятэках раёна прайшоў цыкл мерапрыемстваў да Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам. Гутарка-папярэджанне "Пачні з сябе-жыві бяспечна!" (Воранаўская раённая бібліятэка); гутарка "Не адымай у сябе заўтра" (ф-л "Забалацкая інтэграваная сельская бібліятэка"); дыялог "Беражы сябе для жыцця!" (ф-л "Доцішская сельская бібліятэка"); гутарка "Наш выбар – свет без наркотыкаў" (ф-л "Жырмунская інтэграваная сельская бібліятэка"); гутарка "Наркотыкі – падарожжа ў бездань" (ф-л "Бастунская інтэграваная сельская бібліятэка"); міні-кансультацыя "Бяда завецца наркаманія" (ф-л "Пераганцаўская сельская бібліятэка". Прысутныя даведаліся пра згубны ўплыў наркотыкаў на арганізм чалавека, а таксама пазнаёміліся з матэрыяламі, прадстаўленымі на тэматычных выставах.

У філіяле "Пагародзенская сельская бібліятэка" прайшла гадзіна інфармацыі, "Горькие плоды красивой жизни» з работнікамі філіяла "Пагародзенскі цэнтр культуры і народнай творчасці". Праблема наркаманіі застаецца найбольш актуальнай тэмай грамадства. Удзельнікі мерапрыемства мелі магчымасць абмеркаваць гэту праблему і абмяняцца вопытам работы ў дадзеным напрамку.

## **Самая лепшая на свеце**

Да дня 8 сакавіка ў філіяле "Радунская гарпасялковая бібліятэка" прайшоў конкурс малюнкаў "Цяпло матуліных вачэй". Самымі актыўнымі ўдзельнікамі конкурсу былі вучні 3-х класаў ДУА "Радунская СШ".

У філіяле "Доцішская сельская бібліятэка" прайшла віншавальная акцыя "Пры сонейку-цеплыня, пры матулі-дабрыня!". Усіх жанчын, якія ў гэты дзень прыходзілі ў бібліятэку павіншавалі з надыходзячым святам і ўручылі ім віншавальныя паштоўкі.

Напярэдадні Міжнароднага жаночага дня ў філіяле "Тракельская сельская бібліятэка" была аформлена выстава-віншаванне "Быць жанчынай-вялікае мастацтва".

Упрыгожваннем выставы сталі віншавальныя паштоўкі і падробкі, зробленыя рукамі дзяцей. Таксама на выставе можна было пазнаёміцца з кнігамі пра дабрыню і каханне мам і бабуль.

## *Карыстальнікам прававыя веды*

15 сакавіка ў філіяле "Жырмунская інтэграваная сельская бібліятэка" прайшоў урок дзяржаўнасці "Канстытуцыя – гарант прававой дзяржавы". Падчас мерапрыемства бібліятэкар распавяла пра значэнне Канстытуцыі для дзяржавы ў цэлым і для кожнага грамадзяніна нашай рэспублікі. Былі разгледжаны раздзелы і артыкулы з Канстытуцыі. Таксама бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з асноўнымі правамі і абавязкамі грамадзяніна і са

змяненнямі і дапаўненнямі ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Для наведвальнікаў бібліятэкі была арганізавана кніжная выстава “Канстытуцыя – гарант дзяржавы”.

У філіяле “Забалацкая інтэграваная сельская бібліятэка” прайшоў урок дзяржаўнасці “Гадуем патрыётаў: духоўнасць, веды, традыцыі”. На мерапрыемстве прысутнічалі вучні 8, 9 класаў ДУА “ВПК Забалацкія яслі-сад-сярэдняя школа”. Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення і развіцця канстытуцыйнага права ў нашай рэспубліцы, са структурай Канстытуцыі і з яе асноўнымі часткамі. Таксама бібліятэкар распавяла аб правах і абавязках кожнага грамадзяніна і што ўсе мы павінны паважліва ставіцца да нацыянальнай гісторыі, культуры, мовы, менталітэту народа і асноўнаму закону нашай дзяржавы.

У філіяле “Доцішская сельская бібліятэка” была аформлена тэматычная кніжная паліца “Закон, па якому жыць ”. Наведвальнікі бібліятэкі пазнаёміліся з гісторыяй асноватворнага дакумента нашай краіны, са структурай Канстытуцыі, а таксама са зменамі і дапаўненнямі ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**Хатынь**

Адной з журботных дат — Дню памяці ахвяр Хатыні - быў прысвечаны гадзіна памяці “Трагедыя з памяццю ў сэрцы”, які прайшоў у Воранаўскай раённай бібліятэцы. Супрацоўнікі бібліятэкі, прыклалі нямала намаганняў, каб яно назаўжды запала ў дзіцячыя душы і не пакінула абыякавымі да трагедыі дзіцячыя сэрцы. У вершах вучні Данііл Камінскі і Арына Дарняк, Таццяна Блажэвіч, а таксама ўдзельнікі моладзевага валанцёрскага руху "энергія маладосці" змаглі перадаць трагедыю, якая разыгралася ў маленькай беларускай вёсачцы, якая была размешчана зусім недалёка ад нас. Здавалася, што ад дзіцячых слоў ледзяніць душу і становіцца холадна на сэрцы. Мерапрыемства скончылася прэзентацыяй верша, напісанага Вікторыяй Кашкевіч да гэтай журботнай даты. Таксама прысутным была прадстаўлена тэматычная кніжная выстава “Званы Хатыні”.

У філіяле “Доцішская сельская бібліятэка” прайшоў урок памяці “Час, які нельга забыць...”. Бібліятэкар расказала прысутным аб гісторыі ўзнікнення вёскі Хатынь і аб страшным лёсе яе жыхароў. Затым школьнікам быў паказаны відэаролік Мемарыял “Хатынь”.

Да 79 гадавіны Хатынскай трагедыі і з мэтай выхавання маральных якасцяў і чувст у маладога пакалення, супрацоўнікі філіяла “Радунская гарпасялковая бібліятэка” правялі інфармацыйны час “Попел Хатыні”. На мерапрыемства былі запрошаны навучэнцы пачатковых класаў ДУА “Радунская СШ”. У ходзе мерапрыемства дзеці даведаліся аб трагедыі беларускай вёскі Хатынь, якая адбылася 22 сакавіка 1943 года. Зачыталі ўспаміны сведкі Хатынскай трагедыі

Іосіфа Іосіфавіча Камінскага. Таксама навучэнцы віртуальна пазнаёміліся з мемарыяльным комплексам “Хатынь”.

**Удасканальваем прафесійнае майстэрства**

З мэтай павышэння кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў на працягу 1 квартала праведзены: **круглы стол** “Аб выніках работы бібліятэк за 2021 год і прыярытэтных накірунках дзейнасці на 2022 год”; **школа вучобы** “Інфармацыйна –бібліяграфічная работа сельскіх бібліятэк”.